**Храпавіцкая, Н.** Медалі для воінаў-інтэрнацыяналістаў / Н. Храпавіцкая // Лепельскі край. – 2020. – 7 жн. – С. 8.

## МЕДАЛІ ДЛЯ ВОІНАЎ-ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТАЎ

*Напярэдадні Дня паветрана-дэсантных войскаў і сіл спецыяльных аперацый адбылося пасяджэнне савета Лепельскай раённай арганізацыі грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане». Гэтаму роду войскаў спаўняецца 90 гадоў.*

Перад прысутнымі выступіў старшыня арганізацыі Сяргей Крывель, які павіншаваў усіх, хто праходзіў службу ў ПДВ, пажадаў здароўя, мэтанакіраванасці, спаўнення жаданняў і ўручыў медалі «90 гадоў стварэння Паветрана-дэсантных войскаў».

Так, напрыклад, **Васіль Вашкевіч** родам з Лепельшчыны. Скончыў Слабадскую СШ. Быў прызваны ва Узброеныя Сілы СССР Лепельскім раённым ваенкаматам. У Афганістане хлопец з кастрычніка 1986 па май 1988 года. Узнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі», «За адзнаку ў воінскай службе» II ступені.

**Ігар Вішнеўскі** ў Афганістане з сакавіка 1985 года па май 1986-га. Увесь час знаходзіўся за рулём Урала, забяспечваў ваеннаслужачых прадуктамі і ўсім неабходным.

**Віктар Парахонька** пасля васьмі класаў Стайскай СШ набыў прафесію ў Мінскім ПТВ-107. Пэўны час працаваў у Мінску. Быў прызваны ва УС СССР Мінскім гарадскім ваенкаматам 19 кастрычніка 1985 года. На працягу шасці месяцаў праходзіў службу ў вучэбным падраздзяленні горада Фергана. У Афганістане – з красавіка 1986 па кастрычнік 1987 года.

**Міхаіл Тарасаў** у вогненнай краіне з лістапада 1984-га па лістапад 1985 года. Браў удзел у баявых аперацыях у Панджшэрскай цясніне, правінцыях Кабул, Кунар, Вардак, Лагман, аперацыях па рэалізацыі разведдадзеных, суправаджэнні аўтамабільных калон, ахове кабульскай камендатуры. Узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі».

**Васіль Глушанок** нарадзіўся ў вёсцы Стары Лепель, пасля мясцовай школы вучыўся ў ПТВ-56. У Афганістане з красавіка 1985-га па лістапад 1986 года. Служыў у горадзе Баграм.

Граматай Віцебскай абласной арганізацыі ГА «ВСВВА» ўзнагароджаны **Алег Хрыпаў**, які 10 гадоў быў старшынёй Заслонаўскай пярвічнай арганізацыі. Алег Барысавіч у Афганістане праходзіў службу са жніўня 1987 года па жнівень 1988 года, быў намеснікам начальніка штаба тылу 40-й агульнавайсковай арміі.

**Мікалаю Бурлуцкаму** сёлета спаўняецца 75 гадоў. За актыўны ўдзел у патрыятычным выхаванні моладзі і вялікі ўклад у развіццё грамадскага руху ветэранаў баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў Мікалай Пятровіч таксама ўзнагароджаны граматай.

**Валянцін Святагор** узнагароджаны медалём «100 гадоў Узброеных Сіл СССР».

Пасля ўрачыстасцяў прайшло абмеркаванне рабочых пытанняў.

Створаная ў 90-я гады XX стагоддзя, арганізацыя займаецца вырашэннем сацыяльна-бытавых пытанняў воінаў-інтэрнацыяналістаў, якія пражываюць на тэрыторыі Лепельскага раёна, ваенна-патрыятычным выхаваннем моладзі, ушанаваннем памяці пра вайну, актыўна ўдзельнічае ў грамадскім і палітычным жыцці.

**Наталля ХРАПАВІЦКАЯ**